УДК 811.161.3

УНІВЕРСАЛЬНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ Ў ФРАЗЕАЛАГІЧНАЙ І ПАРЭМІЯЛАГІЧНАЙ ПАДСІСТЭМАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (у еўрапейскім моўным кантэксце) (асноўныя вынікі даследавання)[1]

Ю. А. Петрушэўская
(Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»,
кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі)

Даецца выніковы агляд рэзультатаў выканання НДР "Універсальнае і нацыянальнае ў фразеалагічнай і парэміялагічнай падсістэмах беларускай мовы (у еўрапейскім моўным кантэксце)" у межах ДПНД на 2016–2020 гг.

Мэта работы – вызначыць і апісаць нацыянальны (спецыфічны) і ўніверсальны (агульны з іншымі мовамі) кампаненты ў фразеалагічным і прыказкавым складзе беларускай мовы (на фоне іншых славянскіх і неславянскіх моў) у супастаўляльным і лінгвакультуралагічным аспектах для распрацоўкі лексікаграфічных і лінгвадыдактычных рэсурсаў выкладання беларускай мовы як роднай і як замежнай.

Найбольш важныя вынікі выканання НДР складаюцца з двух аспектаў – фундаментальнага і прыкладнога.

Фундаментальны аспект вынікаў выканання НДР адлюстраваны ў наступных палажэннях. Распрацавана метадалогія вызначэння моўнай спецыфічнасці і нацыянальна-культурнай адметнасці фразеалагічных, прыказкавых адзінак беларускай мовы на фоне іншых славянскіх і неславянскіх моў (на матэрыяле моўнага мінімуму, асноўнага моўнага фонду, корпуса літаратурнай мовы). Устаноўлены асноўныя тыпы міжмоўных падабенстваў / разыходжанняў фразеалагічных, прыказкавых адзінак, дэтэрмінаваныя моўнымі кантактамі беларускай мовы і іншых славянскіх і неславянскіх моў. Устаноўлены ўніверсальны кампанент (агульны, але не дэтэрмінаваны роднасцю моў ці моўнымі кантактамі), інтэрнацыянальны кампанент (агульны, абумоўлены роднасцю моў і/або моўнымі кантактамі), нацыянальны кампанент (спецыфічны, уласцівы толькі беларускай мове на еўрапейскім моўным фоне), іх колькасныя і якасныя характарыстыкі ў складзе фразеалагічнай, прыказкавай падсістэм беларускай мовы. Устаноўлены якасныя і колькасныя характарыстыкі спецыфічнасці і нацыянальна-культурнай адметнасці ўніверсальных, інтэрнацыянальных і ўласна беларускіх прыказкавых адзінак. Устаноўлены найбольш значныя і рэпрэзентатыўныя для лексікаграфічнага апісання, лінгвадыдактычнага апісання (у лінгвістычным, лінгвакультуралагічным плане) адзінкі ўніверсальнага, інтэрнацыянальнага і нацыянальнага кампанентаў прыказкавага фонду беларускай мовы. Фундаментальныя палажэнні, атрыманыя ў выніку даследавання адлюстраваны ў 2 навуковых манаграфіях, у тым ліку за мяжой [7], [9], у 96 навуковых артыкулах, у тым ліку 22 за мяжой, 40 тэзісах. Па выніках даследавання падрыхтавана дзве дысертацыі – доктара навук [10], [11] і кандыдата навук [12], [13].

Прыкладны аспект вынікаў выканання НДР характарызуюць наступныя палажэнні. Распрацаваны прынцыпы і прыёмы слоўнікавага апісання ўніверсальных, інтэрнацыянальных і нацыянальна спецыфічных

1 Даследаванне выканана ў межах навуковага праекта «Універсальнае і нацыянальнае ў фразеалагічнай і парэміялагічнай падсістэмах беларускай мовы (у еўрапейскім моўным кантэксце)» (ДР № 20161332) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фразеалагічных, прыказкавых адзінак беларускай мовы, падрыхтаваны ўзоры фразеаграфічных, парэміяграфічных даведнікаў беларускай мовы (супастаўляльных, перакладных, нарматыўных, лінгвакультурных і інш.). Створаны беларуска-іншамоўны полілінгвальны слоўнік універсальных і інтэрнацыянальных прыказак беларускай мовы (на фоне асноўных еўрапейскіх і шэрага нееўрапейскіх моў), у якім адлюстраваны больш за 950 беларускіх прыказак і каля 8600 іх іншамоўных аналагаў [14]. Распрацавана навукова-метадычнае абгрунтаванне і падрыхтаваны ўзоры лінгвадыдактычнага апісання нацыянальна-моўнай і нацыянальна-культурнай своеасаблівасці спецыфічна беларускіх фразеалагічных, прыказкавых адзінак, нацыянальна-моўнай і нацыянальна-культурнай маркіраванасці інтэрнацыянальных прыказкавых адзінак, нацыянальна-моўнай і нацыянальна-культурнай адметнасці ўніверсальных прыказкавых адзінак (для вывучэння беларускай мовы як роднай і як замежнай). Для апрабацыі вынікаў даследавання праведзены два міжнародных навуковых мерапрыемства [1, с. 105–168], [2, с. 136–229]. Вынікі работы ўкаранены ў адукацыйны працэс у вышэйшай школе Рэспублікі Беларусь (на базе МДУ імя А. А. Куляшова), адлюстраваны ў вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможніках [3], у тым ліку рэкамендаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь [6], [15], [16] і ВМА па гуманітарнай адукацыі ВНУ Рэспублікі Беларусь [4], [5], [8].

Літаратура

1. Восточнославянская идиоматика в европейском языковом контексте // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте – v : сб. науч. ст. / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. – 392 с.
2. Восточнославянская идиоматика в европейском языковом контексте // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте – vI : сб. науч. ст. / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – 480 с.
3. Иванов, Е. Е. Английские пословицы : из литературы и в литературе : этимология, функционирование, варианты = English Proverbs : from Literary Texts, in Literary Texts : Etymology, Usage, Variability : учеб.-метод. пособие / Е. Е. Иванов, Ю. А. Петрушевская. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – 76 с.
4. Иванов, Е. Е. Курсовые работы по языкознанию (фразеология, паремиология, афористика английского языка) : учеб.-метод. пособие / Е. Е. Иванов, Ю. А. Петрушевская. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – 204 с.
5. Иванов, Е. Е. Лингвистика афоризма : учеб.-метод. пособие / Е. Е. Иванов. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – 156 с.
6. Иванов, Е. Е. Лингвистика афоризма. Хрестоматия : учеб. пособие / сост. Е. Е. Иванов. – Минск : Вышэйшая школа, 2018. – 304 с.
7. Иванов, Е. Е. Паремиология без границ : монография / Е. Е. Иванов [и др.] ; под ред. М. А. Бредиса, О. В. Ломакиной. – М. : РУДН, 2020. – 244 с.
8. Иванов, Е. Е. Происхождение и история английских пословиц = The Etymology and History of English Proverbs : учеб.-метод. Пособие / Е. Е. Иванов, Ю. А. Петрушевская. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2019. – 80 с.
9. Іваноў, Я. Я. Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове : манаграфія / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – 208 с.
10. Іваноў, Я. Я. Беларускі фальклорны і літаратурны афарызм як лінгвістычны феномен : семантыка, структура, функцыянаванне : дыс. … д-ра філал. навук : 10.02.01 / Я. Я. Іваноў. – Магілёў, 2020. – 314 с.
11. Іваноў, Я. Я. Беларускі фальклорны і літаратурны афарызм як лінгвістычны феномен : семантыка, структура, функцыянаванне : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук : 10.02.01 / Я. Я. Іваноў. – Мінск, 2021. – 56 с.
12. Петрушэўская, Ю. А. Прыказкавы фонд беларускай мовы : спецыфіка і нацыянальная адметнасць : дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Ю. А. Петрушэўская. – Магілёў, 2020. – 224 с.
13. Петрушэўская, Ю. А. Прыказкавы фонд беларускай мовы : спецыфіка і нацыянальная адметнасць : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / Ю. А. Петрушэўская. – Мінск, 2021. – 29 с.
14. Петрушэўская, Ю. А. Універсальны і інтэрнацыянальны кампаненты ў парэміялагічным складзе беларускай мовы : беларуска-іншамоўны слоўнік / Ю. А. Петрушэўская. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2019. – 316 с.
15. English. Developing Speaking and Writing Skills : учеб. пособие : в 2 ч. / под ред. Е. Н. Василенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – Ч. 1. – 348 с.
16. English. Developing Speaking and Writing Skills : учеб. пособие : в 2 ч. / под ред. Е. Н. Василенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – Ч. 2. – 232 с.

УДК 811.161.3

UNIVERSAL AND NATIONAL IN PHRASEOLOGICAL AND PAREMIOLOGICAL SUBSYSTEMS OF THE BELARUSIAN LANGUAGE (in the context of the european language) (main research results)[1]

Yu. A. Petrushevskaya
(Educational Institution «Mogilev State A. Kuleshov University»,
Department of Theoretical and Applied Linguistics)

[1] The study was carried out within the research project "Universal and national in phraseological and paremiological subsystems of the Belarusian language (in the context of the European language)" (state registration No.20161332) of the subprogram "Belarusian language and literature" of the State research program "Economics and Humanitarian Development of the Belarusian Society" for 2016–2020.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

A final review of the research results "Universal and National in the phraseological and paremiological subsystems of the Belarusian language (in the context of the European language)" within the SPSR for 2016–2020 is given.

The aim of the work is to identify and describe the national (specific) and universal (common with other languages) components in the phraseological and proverbial fund of the Belarusian language (in comparison with other Slavic and non-Slavic languages) in the comparative and cultural linguistic aspects of the development of lexicographic and linguistic methods of teaching the Belarusian language as a native language and as a foreign language.

The most important results of the Science and Research Work consist of two aspects – fundamental and applied ones.

The fundamental aspect of the results of the Science and Research Work implementation is reflected in the following provisions. Methods for determining the linguistic specificity and national and cultural identity of phraseological, proverbial units of the Belarusian language against the background of other Slavic and non-Slavic languages (based on the language minimum, the main language fund, the corpus of the literary language). The main types of interlingual similarities / differences of phraseological, proverbial units, determined by the language contacts of the Belarusian language with other Slavic and non-Slavic languages, have been established. The universal component (common, but do not determined by language kinship or language contacts), international component (common, due to language kinship and / or language contacts), national component (specific, specific only for the Belarusian language on the European language background), their quantitative and qualitative characteristics in the phraseological, proverbial subsystems of the Belarusian language were determined. The qualitative and quantitative characteristics of the specificity and national and cultural identity of universal, international and proper Belarusian proverbs were established. The most significant and representative units of the universal, international and national components of the proverbial fund of the Belarusian language for the lexicographic and linguodidactic description were determined.

The applied aspect of the results of the Science and Research Work is characterized by the following provisions. The principles and methods of the dictionary description of universal, international and nationally and specific phraseological, proverbial units of the Belarusian language were developed, samples of phraseographic, paremiographic reference books of the Belarusian language (comparative, translated, normative, linguocultural, etc.) were evolved. A Belarusian-foreign multilingual dictionary of universal and international proverbs of the Belarusian language (against the background of the main European and a number of non-European languages) were edited, in which there are more than 950 Belarusian proverbs and about 8600 of their foreign analogues. Scientific and methodological substantiation and samples of linguodidactic description of national and language and national and cultural features of specifically Belarusian phraseological and proverbial units, national and language and national and cultural marking of international proverbs, national and language and national studies of the Belarusian language as a native and as a foreign language) were developed.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова